ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА
ВЫШЭЙШАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІ УНІВЕРСІТЭТ»

Кафедра беларускай, рускай і замежных моў

КАБИНЕТ
иностран. языков

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

***Метадычныя ўказанні і пытанні для самакантролю для студэнтаў I курса дзённага і завочнага аддзяленняў***

# Б

Магілёў 2006

УДК 811.161.3
ББК 81.2 Бел.
Б 43

Рэкамендавана да апублікавання
вучэбна-метадычным упраўленнем
ДУ ВПА «Беларуска-Расійскі універсітэт»

Адобрана кафедрай беларускай, рускай і замежных моў «04» мая 2006 г., пратакол № 10

Складальнік канд. філал. навук, дац. А. А. Папейка

Рэцэнзент ст. выкладчык В. В. Панежа

Змяшчаюць пытанні па ўсіх тэмах вучэбнай праграмы па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка». Дапамагаюць сістэматызаваць веды па наступных накірунках: паходжанне і развіццё беларускай мовы, сістэма лексікі, функцыянальныя стылі, тэрміналогія, асаблівасці марфалогіі і сінтаксісу, білінгвізм, моўная інтэрферэнцыя.

Мэтазгодна выкарыстанне студэнтамі I курса дзённага і завочнага аддзяленняў падчас падрыхтоўкі да практычных заняткаў, а таксама да адказу на заліковыя і экзаменацыйныя пытанні.

Вучэбнае выданне

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Адказны за выпуск В. А. Алекса
Тэхнічны рэдактар Н. У. Бяганская
Камп'ютэрная вёрстка Н. П. Паляўнічая

Падпісана ў друк 14.09.2006 Фармат 60x84/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Друк трафарэтны. Умоўн. друк. арк. 0,93. Вуч.-выд. арк. 0,56. Тыраж 315 экз. Заказ № 469.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
Дзяржаўная ўстанова вышэйшай прафесійнай адукацыі
«Беларуска-Расійскі універсітэт»
ЛІ № 02330/375 ад 29.06.2004 г.
212005, г. Магілёў, пр. Міру, 43

© ДУ ВПА «Беларуска-Расійскі універсітэт», 2006

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Спіс пытанняў па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка»

### Частка I

#### 1 Мова і яе асноўныя функцыі

1 Якія гіпотэзы адносна паходжання мовы вы ведаеце?

2 Што разумеюць пад гукапераймальнай і выклічнікавай гіпотэзамі паходжання мовы?

3 Якія погляды на паходжанне мовы з'явіліся ў XIX ст.?

4 Як вы можаце растлумачыць выраз: «Мова – з'ява сацыяльная»?

5 Як паўплывала вынаходніцтва пісьма на развіццё чалавечай культуры?

6 Што вы ведаеце пра гісторыю кнігадрукавання? У чым значэнне вынаходніцтва кнігадрукавання для развіцця мовы, навукі, культуры?

7 Якія асноўныя функцыі выконвае мова?

8 У чым заключана сутнасць камунікатыўнай функцыі мовы?

9 У чым заключана сутнасць намінатыўнай функцыі мовы?

10 У чым заключана сутнасць пазнавальнай функцыі мовы?

11 У чым заключана сутнасць экспрэсіўнай функцыі мовы?

12 У чым заключана сутнасць эстэтычнай функцыі мовы?

13 У чым заключана сутнасць фатычнай функцыі мовы?

#### 2 Паходжанне і развіццё беларускай мовы. Беларуская мова ў Вялікім Княстве Літоўскім

1 Да якой групы і падгрупы моў належыць беларуская мова? Якія яшчэ мовы ўваходзяць у тую ж падгрупу?

2 Калі пачалося выдзяленне славянскіх моўных груп і асобных славянскіх моў з агульнаславянскай мовы?

3 Якая мова была дзяржаўнай у Кіеўскай Русі? Якія літаратурныя помнікі створаны на гэтай мове?

4 Калі пачынае фарміравацца беларуская народнасць і яе мова? Якія гістарычныя падзеі гэтаму папярэднічалі?

5 Што вы можаце сказаць пра этнічны склад Вялікага Княства Літоўскага? Хто ў гэтай дзяржаве складаў этнічную большасць?

6 Чаму мы гаворым, што беларуская мова ў Вялікім Княстве Літоўскім мела дзяржаўны статус, аднак сам тэрмін «беларуская мова» яшчэ не існаваў?

7 Што такое Статут Вялікага Княства Літоўскага і ў чым яго роля ў гісторыі беларускай мовы?

8 Чаму XV–XVI стагоддзі лічацца «залатым векам» у гісторыі беларускай культуры, літаратуры, мовы?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

### 3 Беларуская мова ў Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі

1 Пасля якіх гістарычных падзей беларуская мова на тэрыторыі Беларусі пачынае «страчваць свае пазіцыі»?

2 Якая мова пачынае распаўсюджвацца на тэрыторыі Беларусі з канца XVI ст.? Якія мовы характэрны для дакументаў Літоўскай метрыкі XV–XVI і XVII–XVIII стагоддзяў і чаму?

3 Якую характарыстыку можна даць моўнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі XVII ст. (мова розных сацыяльных груп)?

4 Якое рашэнне было прынята Варшаўскай канферэнцыяй 1696 г. адносна мовы?

5 У якіх гістарычных умовах апынуўся беларускі народ напрыканцы XVIII ст.?

6 Як адбілася ўваходжанне тэрыторыі Беларусі ў склад Расійскай імперыі на існаванні беларускай мовы? Якая мова абвяшчаецца афіцыйнай на беларускай тэрыторыі ў адпаведнасці з загадам Мікалая I (1840 г.)?

7 Да якога часу беларуская мова знаходзілася ў сітуацыі заняпаду? Якімі гістарычнымі падзеямі адзначана заканчэнне перыяду заняпаду?

### 4 Беларуская мова ў пачатку і сярэдзіне XX ст. Б. А. Тарашкевіч і яго «Беларуская граматыка для школ»

1 Якія змены моўнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі адбыліся пасля рэвалюцыі 1917 г.? Якія нарматыўныя акты адносна існавання беларускай мовы ў тыя часы вы ведаеце?

2 Якія асноўныя падзеі з жыцця Б. А. Тарашкевіча вы можаце назваць?

3 Што вы ведаеце пра манаграфію «Беларусы» Я. Ф. Карскага?

4 Што вам вядома пра гісторыю стварэння «Беларускай граматыкі для школ» Б. А. Тарашкевіча?

5 Калі і дзе была надрукавана «Беларуская граматыка для школ» Б. А. Тарашкевіча? Якую пабудову яна мела?

6 У чым заключалася роля Б. А. Тарашкевіча ў выяўленні асноўных прынцыпаў беларускай літаратурнай мовы?

7 Якое значэнне мелі распрацаваныя і адлюстраваныя ў «Беларускай граматыцы для школ» правілы для развіцця беларускай мовы?

### 5 Закон «Аб мовах у БССР» (1990 г.)

1 Калі быў прыняты і ўведзены ў дзеянне закон «Аб мовах у БССР»? Што папярэднічала прыняццю гэтага закона?

2 З якіх раздзелаў і асноўных артыкулаў складаўся закон «Аб мовах у БССР»?

3 У чым заключаны асноўныя ідэі закона «Аб мовах у БССР»?

4 Якім чынам планавалася ўвесці закон «Аб мовах у БССР» у жыццё?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

**6 Мова і маўленне. Формы беларускай мовы**

1 Калі пачалі размяжоўвацца паняцці «мова» і «маўленне»? Які сэнс укладваецца пры гэтым у слова «мова»?

2 Што вы разумееце пад словам «маўленне»? Чым характарызуецца маўленчая дзейнасць?

3 Як звязаны паміж сабой мова і маўленне?

4 Што вы можаце сказаць наконт аднароднасці мовы? Якія разнавіднасці нацыянальнай агульнанароднай мовы вы ведаеце?

5 Як вы разумееце паняцці «літаратурная мова», «дыялект», «жаргон»?

**7 Слова як адзінка мовы. Тыпы значэнняў (слова). Фразеалагізмы**

1 Што такое лексіка і лексікалогія?

2 У чым адрозненне лексікі ад іншых раздзелаў навукі пра мову ў адносінах да рэчаіснасці?

3 Што такое слова?

4 У чым адрозненне знамянальных і незнамянальных слоў?

5 Што такое лексічнае значэнне слова?

6 Што такое граматычнае значэнне слова?

7 Якія словы называюцца адназначнымі і якія – мнагазначнымі?

*8 Якія словы называюцца амонімамі і якімі шляхамі яны ўзнікаюць?* Якія групы амонімаў вы ведаеце?

9 У чым адрозненне паміж мнагазначнымі словамі і амонімамі?

10 Што такое сінонімы? Што такое дамінанта?

11 Якія групы сінонімаў вы ведаеце?

12 Што такое антонімы? Якія словы антанімічных пар не ўтвараюць?

13 Што такое паронімы?

14 Што такое фразеалагізмы?

15 У чым падабенства фразеалагізмаў і словазлучэнняў?

16 У чым падабенства фразеалагізмаў і слоў?

17 Што вы можаце сказаць пра пераклад фразеалагізмаў на іншую мову?

18 Якія шляхі фарміравання беларускай фразеалогіі вы ведаеце?

**8 Лексіка беларускай мовы паводле паходжання. Прыметы запазычанай лексікі**

1 На якія дзве групы падзяляецца лексіка беларускай мовы паводле паходжання?

2 На якія групы падзяляецца спрадвечна беларуская лексіка?

3 На якія групы падзяляецца запазычаная лексіка?

4 Што вы можаце сказаць пра агульнаславянскія словы (часавыя межы, сэнсавыя групы агульнаславянскіх слоў)?

5 Што вы можаце сказаць пра ўсходнеславянскія словы (часавыя межы, сэнсавыя групы ўсходнеславянскіх слоў)?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

6 Што вы можаце сказаць пра ўласнабеларускія словы (часавыя межы, сэнсавыя групы ўласнабеларускіх слоў)?

7 Якую лексіку называюць «славянскімі запазычаннямі»?

8 Якая лексіка называецца «неславянскімі запазычаннямі»? Якія словы называюцца інтэрнацыянальнымі?

9 Якія прыметы запазычаных слоў вы можаце назваць?

**9 Лексіка агульнаўжывальная і абмежаванага ўжывання. Актыўная і пасіўная лексіка**

1 На якія дзве групы падзяляюцца словы беларускай мовы паводле сферы ўжывання? Словы якой групы пераважаюць у беларускай мове?

2 Якія словы належаць да лексікі абмежаванага ўжывання?

3 Якія словы называюцца дыялектнымі? Якую функцыю выконваюць дыялектныя словы ў мясцовых гаворках і ў мастацкай літаратуры?

4 Якія словы адносяцца да спецыяльных слоў? Які сэнс вы ўкладваеце ў словы «навуковыя тэрміны» і «прафесіяналізмы»?

5 На якія групы падзяляецца лексіка беларускай мовы паводле актыўнасці ўжывання носьбітамі беларускай мовы?

6 Якія словы лічацца ўстарэлымі? Што такое гістарызмы і архаізмы?

7 Якія словы называюцца неалагізмамі? У сувязі з чым звычайна з'яўляецца значная частка неалагізмаў і што можа адбывацца з неалагізмамі з цягам часу?

**10 Лексікаграфія. Тыпы слоўнікаў**

1 Што такое «лексікаграфія»? Якія этапы развіцця беларускай лексікаграфіі вы ведаеце?

2 Як называецца і чым характарызуецца першы перыяд развіцця слоўнікавай справы на тэрыторыі Беларусі?

3 Як называецца і чым адзначаны другі перыяд развіцця лексікаграфіі на тэрыторыі Беларусі?

4 Якую назву мае трэці перыяд развіцця беларускай лексікаграфіі і ў чым заключаецца яго адметнасць?

5 На якія тыпы падзяляюцца ўсе слоўнікі паводле адбору слоў, мэт і спосабаў іх апісання?

6 Што вы можаце сказаць пра энцыклапедычныя слоўнікі?

7 Што апісваецца ў лінгвістычных слоўніках? У чым сутнасць адрозненняў паміж двух- і шматмоўнымі лінгвістычнымі слоўнікамі (з аднаго боку) і аднамоўнымі (з другога)?

8 Якія віды аднамоўных лінгвістычных слоўнікаў вы ведаеце?

9 Якія звесткі змяшчаюцца ў тлумачальных слоўніках?

10 Якая лексіка апісваецца ў гістарычных, этымалагічных, тэрміналагічных слоўніках, у слоўніках іншамоўных слоў, слоўніках мовы пісьменніка?

11 Якія звесткі прыводзяцца ў фразеалагічных слоўніках?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

12 Што падаецца ў арфаграфічных, арфаэпічных, марфемных слоўніках?

13 Што фіксуецца і апісваецца ў анамастычных слоўніках? На якія віды падзяляюцца анамастычныя слоўнікі?

14 Што адлюстроўваецца ў асацыятыўных слоўніках? Для чаго такія слоўнікі прызначаны?

15 Як будуюцца і для чаго прызначаюцца слоўнікі сінонімаў, паронімаў, амонімаў, антонімаў?

**11 Паняцце стыляў. Стылістычныя пласты лексікі**

1 Што такое «стыль мовы»? Якія асноўныя функцыянальныя стылі вы можаце назваць?

2 Як вы разумееце паняцці «нейтральная лексіка», «кніжная лексіка», «гутарковая лексіка»? Якія словы вылучаюцца ў межах гутарковай лексікі?

3 Чым характарызуецца службова-справавы (афіцыйна-справавы) стыль?

4 Як вы можаце ахарактарызаваць навуковы стыль?

5 Якія характэрныя рысы мае публіцыстычны стыль?

6 Якія адметныя рысы характарызуюць гутарковы стыль?

7 У чым заключаецца адметнасць мастацкага стылю?

**12 Мова навукі і яе асаблівасці**

1 Што вы разумееце пад лексічнымі асаблівасцямі навуковых тэкстаў?

2 Якія словы складаюць аснову лексікі навуковага стылю?

3 Што вы можаце сказаць пра словы агульнанавуковага выкарыстання і пра тэрміны?

4 У чым заключаецца адметнасць выкарыстання фразеалагізмаў у навуковых тэкстах?

5 Што вы можаце сказаць пра выкарыстанне дзеясловаў, назоўнікаў, займеннікаў, прыметнікаў, дзеепрыметнікаў у навуковых тэкстах?

6 Праз ужыванне якіх сінтаксічных сродкаў выяўляецца спецыфіка навуковых тэкстаў?

**13 Тэрміналогія: спецыфіка тэрмінаў**

1 Што такое тэрмін? З якой мэтай тэрміны ствараюцца і што яны абазначаюць?

2 Якія значэнні мае слова «тэрміналогія»? Што гэта такое?

3 У чым заключаюцца асноўныя адрозненні паміж тэрмінамі і агульналітаратурнымі словамі?

4 Што вы можаце сказаць пра адназначнасць і мнагазначнасць тэрмінаў?

5 Як вы разумееце такія спецыфічныя рысы тэрмінаў, як сістэмнасць, адсутнасць экспрэсіі і эмоцыі?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

## 14 Тэрміналогія: лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў

1 З чым суадносяцца тэрміны паводле сваёй будовы? Словы якіх часцін мовы выкарыстоўваюцца ў якасці тэрмінаў?

2 Што вы ведаеце пра выкарыстанне назоўнікаў (агульных і ўласных), прыметнікаў, дзеясловаў, прыслоўяў у якасці тэрмінаў?

3 Як вы разумееце паняцці «свабодныя» і «несвабодныя» тэрміны-словазлучэнні?

4 Якое слова выступае апорным у трох- і шматслоўных тэрмінах-словазлучэннях? З чым звязана выкарыстанне ў беларускай навуковай тэрміналогіі шматслоўных тэрмінаў?

## 15 Тэрміналогія: паходжанне тэрмінаў

1 З якіх пластоў паводле паходжання складаецца тэрміналагічная лексіка?

2 Што вы ведаеце пра тэрміналагізацыю (г. зн. пра пераасэнсаванне агульнаўжывальных слоў і пераход іх у тэрмінасістэмы)? Якія словы найчасцей ужываюцца ў якасці тэрмінаў?

3 Што вы можаце сказаць пра выкарыстанне інтэрнацыянальных сродкаў у тэрміналогіі?

4 Чым тлумачыцца наяўнасць у мове запазычаных тэрмінаў? Якія адметныя асаблівасці запазычвання тэрмінаў вы ведаеце?

5 Запазычанні з якіх моў найчасцей выкарыстоўваюцца ў якасці тэрмінаў у беларускай тэрміналогіі? Як уплываюць фанетыка, графіка, арфаграфія беларускай мовы на запазычаныя словы-тэрміны?

## 16 Тэрміналогія: утварэнне тэрмінаў

1 Якія асноўныя спосабы ўтварэння тэрмінаў вы ведаеце?

2 У чым заключаецца сутнасць сінтаксічнага спосабу ўтварэння тэрмінаў? Што такое «непадзельныя» і «фармальна падзельныя» сінтаксічныя тэрміны?

3 Якія асноўныя мадэлі (паводле часцін мовы) тэрміналагічных адзінак сінтаксічнага спосабу ўтварэння вы можаце назваць?

4 У чым заключаецца суфіксальны спосаб тэрмінаўтварэння? Якія суфіксы выкарыстоўваюцца найбольш часта?

5 Як вы разумееце прэфіксальны, прэфіксальна-суфіксальны, бяссуфіксны, складана-суфіксальны спосабы ўтварэння тэрмінаў?

6 Што вы разумееце пад аснова- і словаскладаннем у тэрмінаўтварэнні?

7 У чым заключаецца абрэвіятурны спосаб утварэння тэрмінаў? На якія віды ён падзяляецца?

8 У чым сутнасць семантычнага спосабу тэрмінаўтварэння? Якую адметнасць мае гэты спосаб утварэння ў параўнанні з агульналітаратурнай мовай?

9 Якія асноўныя спецыфічныя рысы ўзнікнення тэрмінаў (незалежна ад пэўнай тэрмінасістэмы ці спосабу ўтварэння) вы можаце назваць?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Частка II

### 1 Паняцце літаратурнай нормы. Прынцыпы беларускай арфаграфіі

1 Як вы разумееце паняцце «літаратурная мова»?

2 Што такое літаратурная норма? Якімі могуць быць нормы літаратурнай мовы паводле ступені абавязковасці?

3 Якія віды літаратурнай нормы вылучаюцца ў залежнасці ад пэўнага месца ў моўнай сістэме?

4 Якія існуюць асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі? У чым заключаецца іх сутнасць?

5 Што такое традыцыйныя і дыферэнцыйныя напісанні?

### 2 Білінгвізм як аб'ектыўная рэальнасць. Аспекты білінгвізму

1 Што такое білінгвізм? Чаму з'ява двух- і шматмоўя на сённяшні дзень з'яўляецца характэрнай для многіх краін свету?

2 Што абазначаюць паняцці індывідуальны білінгвізм, групавы білінгвізм, поўны білінгвізм, нацыянальны білінгвізм, дзяржаўны білінгвізм?

3 У якіх трох аспектах разглядаецца з'ява двухмоўя? У чым заключаецца іх сутнасць?

4 Што вы ведаеце пра існаванне двухмоўя на тэрыторыі Беларусі ў плане гісторыі?

5 З якіх асноўных момантаў складаецца сучасная моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь?

6 Што такое дыглосія і як яна праяўляецца ў беларускай мове на тэрыторыі нашай краіны?

### 3 Паняцце моўнай інтэрферэнцыі. Віды інтэрферэнцыі

1 Што такое моўная інтэрферэнцыя? Якія асноўныя прычыны выклікаюць моўную інтэрферэнцыю?

2 Як вы разумееце паняцце фанетычнай і акцэнтнай інтэрферэнцыі?

3 Што такое лексічная інтэрферэнцыя? Пры якіх умовах лексічная інтэрферэнцыя ўзнікае найчасцей?

4 Як вы разумееце марфалагічную і словаўтваральную інтэрферэнцыю?

5 Што разумеюць пад сінтаксічнай інтэрферэнцыяй?

### 4 Назоўнік: агульная характарыстыка, асноўныя граматычныя катэгорыі

1 Якая часціна мовы атрымала назву «назоўнік»? Што назоўнікі абазначаюць і якую сінтаксічную ролю выконваюць у сказе?

2 На якія разрады падзяляюцца назоўнікі ў залежнасці ад лексічнага значэння?

3 На якія групы падзяляюцца назоўнікі паводле катэгорыі роду? Як вы-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

значаецца род назоўнікаў у большасці выпадакаў?

4 Як вызначаецца род нескланяльных назоўнікаў іншамоўнага паходжання, род нескланяльных абрэвіятур?

5 Што вы ведаеце пра катэгорыю ліку назоўнікаў?

6 Што такое склон? Якія склоны ёсць у сучаснай беларускай мове?

## 5 Назоўнік: тыпы скланення, склонавыя канчаткі

1 Што такое скланенне назоўнікаў? Ад чаго залежаць склонавыя канчаткі назоўнікаў?

2 Якія тыпы скланення назоўнікаў ёсць у беларускай мове і як яны вызначаюцца?

3 Якія назоўнікі не ўваходзяць ні ў адзін з тыпаў скланення?

4 Якія тыпы асноў назоўнікаў вылучаюцца ў беларускай мове?

5 Якія канчаткі маюць ва ўскосных склонах назоўнікі I скланення?

6 Якія канчаткі маюць ва ўскосных склонах назоўнікі II скланення?

7 Якія канчаткі маюць ва ўскосных склонах назоўнікі III скланення?

8 Якія канчаткі маюць ва ўскосных склонах рознаскланяльныя назоўнікі?

9 Якія склонавыя канчаткі маюць назоўнікі ў форме множнага ліку?

## 6 Назоўнік: утварэнне. Правапіс складаных назоўнікаў

1 Як утвараюцца ацэначныя формы назоўнікаў? Якія ацэначныя суфіксы пры гэтым выкарыстоўваюцца і якія адценні яны надаюць назоўнікам?

2 Якія суфіксы выкарыстоўваюцца пры ўтварэнні назоўнікаў суфіксальным спосабам? Назоўнікі з якімі значэннямі пры гэтым утвараюцца?

3 Што вы ведаеце пра прыставачны і прыставачна-суфіксальны спосабы ўтварэння назоўнікаў?

4 Калі складаныя назоўнікі пішуцца разам і калі праз злучок?

## 7 Прыметнік: агульная характарыстыка, разрады, ступені параўнання

1 Што такое прыметнік? Як можа перадавацца прымета прадмета?

2 Што абазначаюць і чым характарызуюцца якасныя прыметнікі?

3 Што абазначаюць і чым характарызуюцца адносныя прыметнікі?

4 Што вы ведаеце пра поўныя і кароткія прыметнікі?

5 Якія ступені параўнання ёсць у якасных прыметнікаў? Як утвараюцца і што абазначаюць ступені параўнання прыметнікаў?

6 Якія прыметнікі не маюць ступеней параўнання?

7 Як утвараюцца і што абазначаюць формы ацэнкі і меры якасці?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

**8 Прыметнік: утварэнне, скланенне. Правапіс складаных прыметнікаў**

1 Якія існуюць асноўныя спосабы ўтварэння прыметнікаў? Ад слоў якіх часцін мовы найчасцей утвараюцца прыметнікі?

2 Якія суфіксы найчасцей выкарыстоўваюцца пры суфіксальным утварэнні прыметнікаў?

3 Што вы можаце сказаць пра прыставачны і прыставачна-суфіксальны спосабы ўтварэння прыметнікаў?

4 Што вы ведаеце пра асноваскладанне, словаскладанне, складана-суфіксальны спосаб утварэння прыметнікаў?

5 Што вы можаце сказаць пра скланенне якасных, адносных, прыналежных прыметнікаў (мужчынскага, жаночага, ніякага роду; у форме адзіночнага і множнага ліку)?

6 Калі складаныя прыметнікі пішуцца разам і калі праз злучок?

**9 Лічэбнік: агульная характарыстыка, скланенне, правапіс**

1 Якая часціна мовы называецца лічэбнікам? На якія разрады падзяляюцца лічэбнікі паводле значэня, граматычных уласцівасцей і характару ўжывання?

2 Што абазначаюць колькасныя лічэбнікі? На якія тры групы яны падзяляюцца?

3 У чым спецыфіка колькасных лічэбнікаў у беларускай мове (у параўнанні з рускай)?

4 Што вы ведаеце пра парадкавыя лічэбнікі?

5 Якія сродкі выкарыстоўваюцца ў беларускай мове для абазначэння прыблізнай колькасці?

6 Што вы ведаеце пра скланенне і правапіс колькасных лічэбнікаў?

7 Што вы можаце сказаць пра скланенне і правапіс парадкавых, зборных і дробавых лічэбнікаў?

**10 Дзеяслоў: агульная характарыстыка, асноўныя граматычныя катэгорыі, спражэнне, правапіс**

1 Якая часціна мовы называецца дзеясловам? Якія асноўныя граматычныя катэгорыі мае дзеяслоў? Што такое спрагальныя і няспрагальныя формы дзеяслова?

2 Што вы ведаеце пра неазначальную форму дзеяслова?

3 Якія формы дзеяслова ўтвараюцца ад асновы інфінітыва і якія ад асновы цяперашняга часу?

4 Як вы разумееце паняцці «пераходныя» і «непераходныя» дзеясловы?

5 Што вы ведаеце пра зваротныя дзеясловы?

6 Што такое стан дзеяслова? На якія групы падзяляюцца дзеясловы ў межах гэтай катэгорыі?

7 Што такое трыванне дзеяслова? Што абазначаюць дзеясловы закончанага і незакончанага трывання?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

8 Што абазначае катэгорыя ладу дзеяслова? Што вы ведаеце пра абвесны, загадны, умоўны лад дзеясловаў?

9 Што абазначае катэгорыя часу дзеяслова? Што вы можаце сказаць пра цяперашні, прошлы, будучы час дзеясловаў?

10 Як вы разумееце паняцці «асабовыя» і «безасабовыя» дзеясловы?

11 Што называецца спражэннем дзеяслова? Якія дзеясловы адносяцца да I спражэння і якія да II спражэння?

12 Якія дзеясловы з'яўляюцца рознаспрагальнымі?

13 Якія асаблівасці мае правапіс суфіксаў і асабовых канчаткаў дзеясловаў?

**11 Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе: утварэнне і ўжыванне**

1 Якая часціна мовы называецца дзеепрыметнікам? Што такое дзеепрыметны зварот і якія знакі прыпынку пры ім ставяцца?

2 Што агульнага мае дзеепрыметнік і дзеяслоў?

3 Што агульнага паміж дзеепрыметнікам і прыметнікам?

4 Як утвараюцца дзеепрыметнікі прошлага часу (незалежнага і залежнага стану)?

5 Як утвараюцца дзеепрыметнікі цяперашняга часу (незалежнага і залежнага стану)?

6 Што вы ведаеце пра ступень ужывальнасці той ці іншай формы дзеепрыметніка? Што трэба рабіць падчас перакладу неўжывальнай формы рускага дзеепрыметніка на беларускую мову?

7 Якія асаблівасці мае правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў (у залежнасці ад характару асновы, да якой далучаецца суфікс)?

8 Якая часціна мовы называецца дзеепрыслоўем? Што такое дзеепрыслоўны зварот і якія знакі прыпынку пры ім ставяцца?

9 Што агульнага маюць дзеепрыслоўі з дзеясловамі і прыслоўямі?

10 Што абазначаюць і як утвараюцца дзеепрыслоўі (незакончанага і закончанага трывання)?

11 Якое дзеянне абазначае дзеепрыслоўе ў сказе? Якія памылкі з'яўляюцца найбольш частымі пры ўжыванні дзеепрыслоўяў у сказе і які існуе шлях для іх выпраўлення?

**12 Сінтаксічная інтэрферэнцыя: асаблівасці дапасавання і кіравання**

1 Якія існуюць віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэннях?

2 Чым выклікаюцца адметныя рысы некаторых словазлучэнняў з сінтаксічнай сувяззю дапасавання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай)? У чым заключаюцца гэтыя асаблівасці (прыклады)?

3 Якія словазлучэнні з сінтаксічнай сувяззю кіравання адзначаны найбольшай спецыфікай?

4 Што вы можаце сказаць пра словазлучэнні, у якія ўваходзяць дзеясловы думкі, пачуцця, волевыяўлення, руху?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5 Якія адметныя рысы ва ўжыванні прыназоўнікаў у беларускай мове вы можаце назваць?

6 Што трэба ведаць пра ўжыванне параўнальных словазлучэнняў з асноўным словам прыметнікам ці прыслоўем у форме вышэйшай ступені параўнання?

**13 Паняцце дакумента. Мова дакументаў. Апісанне відаў дакументаў**

1 Як вы разумееце паняцце «дакумент»? Як змяняўся змест гэтага паняцця з цягам часу?

2 Якія групы дакументаў вылучаюцца падчас разгляду дзейнасці ўстановы? Якія дакументы ўваходзяць у гэтыя групы?

3 Якія групы дакументаў вылучаюцца паводле формы?

4 Што такое «рэквізіт» у дачыненні да паняцця дакумента?

5 Якая разнавіднасць мовы выкарыстоўваецца для напісання дакументаў? У якой форме выкладаецца інфармацыя ў дакументах (у параўнанні з тэкстамі іншых тыпаў)?

6 Якія асноўныя асаблівасці мовы дакументаў вы ведаеце?

7 Што вы ведаеце пра ўзор складання такіх дакументаў, як акт, аўтабіяграфія, даведка, дагавор, даручэнне, загад, заява, пратакол, распіска, справавы ліст?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова